Система предтекстовых упражнений включает в себя грамматические задания, готовящие к чтению и восприятию текста (образование форм множественного числа существительных, отглагольных существительных, согласование существительных с прилагательными). Для закрепления каждой грамматической модели предлагаются письменные упражнения, направленные на осмысление теоретических положений и выработку речевых умений.

Послетекстовые задания включают систему вопросов к тексту. Особое внимание уделяется работе с лексикой: образованию однокоренных слов, поиску антонимов, синонимов. Для закрепления материала предложены обобщающие вопросы, тестовые задания, кроссворды, таблицы. Имеют место и такие задания, как пересказ текста по плану, составление конспекта текста, выступление с устным сообщением на данную тему.

В качестве проверочных для большинства тем введены тестовые задания и упражнения для развития навыков устной и письменной речи

Данное учебное издание предполагает использование иллюстративного мультимедийного материала на различных этапах усвоения темы. В пособие также включены задания для самостоятельной работы учащихся.

Благодаря комплексной работе с научным текстом осуществляется формирование языковой компетенции будущих специалистов.

**Литература**


1. Арутюнов, А.Р. Теория и практика создания учебника русского языка для иностранцев / А.Р. Арутюнов. – М., 1990.
2. Основы научной речи: Учеб. пособие для студ. нефилол. высш. учеб. заведений / Н.А. Буре, М.В. Быстрых, С.А. Вишнякова и др.; под ред. В.В.Химика, Л.Б.Волковой. — СПб.: Филологический факультет СПбГУ; М.: Издательский центр «Академия», 2003. — 272 с.
3. Русский язык для биологов: Учеб. пособ. для иностранных студентов и аспирантов / Казан. гос. ун-т; Филол. фак-т; Каф. совр. рус. яз.; Сост. Е.М.Бастрикова.– Казань: Казан. гос. ун-т, 2005. – 43 с.
4. Русский язык как иностранный. Научный стиль речи / Пособие для самостоятельной работы (домашнее чтение на материале текстов по специальности). Гуманитарный, медицинский, технический, экономический профиль / Л.А. Константинова, Г.И. Знаменская, О.В. Илюхина, Н.М. Исакина, С.А. Юрманова. – Тула: Изд-во ТулГУ, 2010. – 148 с.



**А.Б. Гурновіч** (Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, г. Мінск)


## ВЫКАРЫСТАННЕ МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВАЙ ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”

Падрыхтоўка кампетэнтнага, ініцыятыўнага, канкурэнтназдольнага спецыяліста, гатовага да эфектыўнай працы па спецыяльнасці і пастаяннага прафесійнага росту – адна з важнейшых задач сучаснай вышэйшай школы. У вырашэнні гэтай задачы вялікая роля належыць інавацыйным тэхналогіям.

У апошні час шмат увагі надаецца модульна-рэйтынгавай тэхналогіі навучання, асноўнай мэтай укаранення якой з’яўляецца, на наш погляд, павышэнне якасці навучання за кошт інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу, актывізацыі працы прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў.

Разгледзім укараненне модульна-рэйтынгавай тэхналогіі навучання пры вывучэнні дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”. Разбіўка курса на модулі будуецца зыходзячы з патрабаванняў, выкладзеных у Адукацыйным стандарце і вучэбнай праграме.

Вучэбны курс можна раздзяліць на два асноўныя модулі і тры модулі дапаможнага характару. Два асноўныя модулі ахопліваюць тэарэтычны змест вучэбнага матэрыялу. Яны



Репозиторий ВГУ

ідуць пад нумарамі (М-1, М-2). Тры модулі дапаможнага характару з'яўляюцца абавязковымі, дзякуючы ім вучэбны курс атрымоўвае завершаны выгляд. Модуль нулявы (М-0) служыць уводзінамі ў вывучэнне курса (абазначае комплексную мэту, прад'яўляе структуру курса, асноўныя паняцці і сістэму кантролю атрыманых ведаў).

Модуль-рэзюмэ (М-R) дае абагульненне курса.

Модуль-кантроль (М-К) забяспечвае выніковы кантроль па курсу.

Графічную схему курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" можна прадставіць наступным чынам:

М-0 М-1 М-2 М-R М-К

М-0 – Уводзіны. Мэты і задачы курса. Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў. Білінгвізм. Інтэрферэнцыя.

М-1 – Стылі мовы. Культура маналагічнага і дыялагічнага маўлення.

М-2 – Беларуская навуковая тэрміналогія. Класіфікацыя тэрмінаў. Спосабы тэрмінаўтварэння. Інтэрнацыянальныя і ўласнабеларускія тэрміны. Асаблівасці перакладу тэрмінаў з рускай мовы на беларускую.

(М-R) – Рэзюмэ. Абагульненне.

(М-К) – Выніковы кантроль (залік).

Змяняецца роля выкладчыка, задача якога навучыць студэнтаў набываць свае веды самастойна, садзейнічаць развіццю ў навучэнцаў імкненняў і здольнасцей да пастаяннага ўзбагачэння ведаў, творчага іх выкарыстання на працы, у будучай прафесійнай дзейнасці, да бесперапыннай самаадукацыі. Цэнтр цяжару пераносіцца на саманавучанне, таму значна ўзрастае роля кіруемай самастойнай працы студэнтаў (КСПС), эффектыўнасць якой забяспечваецца наяўнасцю сістэмнасці ў яе арганізацыі і правядзенні.

Вельмі важны і найбольш працаёмкі падрыхтоўчы этап. Прадумваецца ўся сістэма арганізацыі КСПС. У вучэбнай праграме выдзяляюцца тэмы для КСПС з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры, формы справаздачы. Самастойная праца студэнтаў павінна забяспечвацца спецыяльнай вучэбна-метадычнай літаратурай. На кафедры беларускай і рускай моў БДАТУ падрыхтаваны і выдадзены вучэбныя і практычныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)". Створаны практыкумы для кожнага факультэта, якія складаюцца з комплексу заданняў і практыкаванняў для самастойнай працы студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыка, тэкстаў па спецыяльнасці для аналізу і перакладу і кароткага руска-беларускага слоўніка тэрміналагічных паняццяў. У бібліятэцы ўніверсітэта маюцца электронныя версіі ўсіх матэрыялаў.

Падрыхтоўчы этап уключае і дыягностыку ўзроўню падрыхтаванасці студэнтаў – уваходны кантроль ведаў.

На другім этапе вызначаюцца мэты індывідуальнай і групавой дзейнасці студэнтаў, праводзяцца ўстановачныя кансультацыі. Агучваюцца тэрміны і формы прадстаўлення прамежкавых вынікаў.

Мэта трэцяга этапу – забяспечыць станоўчую матывацыю дзейнасці і праверку прамежкавых вынікаў; арганізацыю самакантролю і самакарэкцыі ведаў.

Вучэбная матывацыя праяўляецца ў разуменні студэнтам карыснасці выконваемай працы. Неабходна паказаць яму важнасць выконваемай працы як у плане прафесійнай падрыхтоўкі, так і ў плане пашырэння кругагляду, эрудыцыі спецыяліста.

Важна сфарміраваць дастатковую ступень падрыхтаванасці студэнта да самастойнай працы, пэўны ўзровень яго самадысцыпліны.

Чацвёрты этап уключае індывідуальныя і групавыя справаздачы і іх ацэнку.

Рэпазіторый ВГУ

Па вывучаемай дысцыпліне вынікі прадстаўляюцца ў выглядзе вусных паведамленняў на дадзеную тэму, дакладаў, рэфератаў, анатацый артыкулаў, аналізу тэставання, перакладаў тэкстаў па спецыяльнасці студэнтаў.

Паколькі дысцыпліна выкладаецца на першым, часткова другім курсах, вельмі важна навучыць студэнтаў самастойна працаваць з падручнікамі, кнігамі, правільна канспектаваць матэрыял (вылучаць галоўную інфармацыю з абзацаў, перабудоўваць сказы, ствараючы лагічна звязны, універсальны, аб'ектыўны тэкст, у якім утрымліваюцца не толькі асноўныя палажэнні і вывады, але і факты, доказы, прыклады, ілюстрацыі), пазнаёміць з рознымі тыпамі канспектаў: планавымі, тэкстуальнымі, свабоднымі, тэматычнымі, што дапаможа студэнтам у выкананні больш складаных відаў самастойнай працы і даследчай дзейнасці, у напісанні рэфератаў, дакладаў, курсавых работ, дакладаў на студэнцкія навуковыя канферэнцыі і г.д. Не менш карысным з'яўляецца і выпрацоўка навыкаў рэферыравання, напісання анатацый, рэзюмэ спецыяльных тэкстаў.

Неабходна фарміраваць у студэнтаў разуменне таго, што без сістэматычнай самастойнай працы нельга стаць добра падрыхтаваным, канкурэнтназдольным спецыялістам.

Важнай умовай інтэнсіфікацыі самастойнай працы з'яўляецца яе выражаны творчы характар.Таму вялікая ўвага ўдзяляецца выкананню творчых заданняў: падрыхтоўка і ўдзел у такіх актыўных формах навучання, як дзелавая гульня (напрыклад, па тэме: "Маўленчы службовы этыкет. Культура маналагічнага і дыялагічнага маўлення"), прэс-канференцыя, дыялог-спрэчка (па тэме "Стылі мовы"). Неабходна стымуляваць пошукавую і даследчую працу студэнтаў у пазааўдыторны час, якой надаецца вялікае значэнне ў аптымізацыі вучэбнага працэсу. Вітаюцца публікацыі артыкулаў студэнтаў па матэрыялах студэнцкіх навуковых канферэнцый ва ўніверсітэцкай газеце "Аграінжынер", у зборніку навуковых прац студэнтаў і магістрантаў "Тэхсервіс", а таксама ў зборніках творчасці студэнтаў і супрацоўнікаў БДАТУ: "Край мой родны", "Не хлебам адзіным…", "Святло матуліных вачэй", "Вясна, каханне, маладосць", "Юнацтва нашага шляхі". Такі падыход садзейнічае выпрацоўцы ў навучэнцаў патрэбы ў даследаванні, выхаванню навыкаў творчага падыходу да рашэння канкрэтных задач, пашырэнню навуковага і інтэлектуальнага кругагляду будучага спецыяліста, а таксама больш глыбокаму засваенню праграмнага матэрыялу, выхоўвае ў будучых спецыялістаў пачуццё любові да роднай зямлі, свайго народа, яго традыцый, мовы.

Усе віды самастойнай працы студэнтаў ацэньваюцца выкладчыкам сістэмай балаў, што ўплывае на канчатковы рэйтынг навучэнцаў. Прычым улічваецца як змест выкананай работы (напрыклад даклада, рэферата, паведамлення), так і якасць вуснага выступлення: валоданне мовай, вобразнасць, дарэчнасць, дакладнасць, выразнасць і чысціня маўлення, прэзентацыя матэрыялу, уменне гаварыць публічна, зацікавіць слухачоў.

Такім чынам, кантралюемая самастойная праца студэнтаў у складзе модульна-рэйтынгавай тэхналогіі навучання дазваляе:

– больш рацыянальна размяркоўваць заданні для самастойнай працы на працягу семестра;
– ажыццяўляць сістэматычны кантроль за авалоданнем студэнтамі вучэбнага матэрыялу для выяўлення і ліквідацыі прабелаў у ведах (тэставанне, кантрольныя работы, калёквіумы, камп'ютарныя кантралюючыя праграмы);
– стымуляваць сістэматычную самастойную працу студэнтаў па паглыбленню ведаў;
– заахвочваць творчую, навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў;
– павышаць узровень самаацэнкі навучэнцаў;
– садзейнічаць павышэнню цікавасці да працэсу навучання, развіццю асобасных якасцей навучэнцаў, іх маўленчай кампетэнцыі.



Рэпазіторый БГТУ